## З вопыту работы па стварэнню асяроддзя міжкультурнага ўзаемадзеяння

*Новікаў С.Я., загадчык кафедры айчыннай гісторыі і сусветнай культуры МДЛУ*

Кафедрай айчыннай гісторыі і сусветнай культуры МДЛУ назапашаны пэўны вопыт па стварэнні асяроддзя **міжкультурнага ўзаемадзеяння** ў ходзе працы са студэнтамі ў нашай ВНУ ў аўдыторны і пазааўдыторны час.

Стварэнне асяроддзя міжкультурнага ўзаемадзеяння за часам аўдыторных заняткаў адбываецца ў ходзе выкладання цэлага спектра вучэбных дысцыплін, у тым ліку: "*Асноў культурнай антрапалогіі*", "*Гісторыі Беларусі*", "*Культуралогіі*", "*Параўнальнай культуралогіі*" і інш. Гэтыя дысцыпліны дапамагаюць закласці трывалы маральны падмурак пад будучую прафесію нашых выпускнікоў, асабліва ў аспекце міжкультурнага ўзаемадзеяння: так, на занятках па "*Асновах культурнай антрапалогіі*" ставіцца мэта па стварэнні ў студэнцкім асяроддзі неабходных культуралагічных асноў па фарміраванні *міжкультурнага, міжканфесійнага і міжнацыянальнага дыялогу*; на занятках па "*Гісторыі Беларусі*" выкладчыкі бачаць свае задачы ў фарміраванні культуры будучага праз вопыт мінулага з улікам гістарычных не толькі міжнацыянальных, міжкультурных, але і *міждзяржаўных адносін*; на занятках па "*Культуралогіі*" адбываецца фарміраванне ў студэнтаў важнейшых арыенціраў міжкультурнага ўзаемадзеяння на аснове *культурнага дыскурсу*, асабліва ў аўдыторыі са студэнтамі з іншых краін, у тым ліку з Расіі, Украіны, Туркменістана, Кітая, Карэі, В'етнама, Ірана, Ірака, Турцыі, Егіпта, Польшчы, Германіі, Нарвегіі і інш.; на занятках "*Параўнальная культуралогія*", аснову якой складаюць тэмы па выяўленні міжканфесійных, рэлігійных і этнакультурных адрозненняў, вырашаюцца задачы па выпрацоўцы ў студэнтаў камунікатыўнай практыкі і міжкультурнага ўзаемадзеяння з улікам выяўлення мульці- і полікультурнага асяроддзяў. Галоўнай задачай пры гэтым бачыцца выпрацоўка кампрамісных рашэнняў, накіраваных на стварэнне ўмоў для пошуку шляхоў міжкультурнага ўзаемадзеяння. На арыгінальных матэрыялах праводзіцца аналіз іншакультурнага асяроддзя з пазіцый пошуку

*культуралагічнага кампрамісу*; *сацыялізацыі студэнтаў* у кантэксце сусветнай культуры ў значнай ступені садзейнічаюць вучэбныя курсы *"Культура краіны вывучаемай мовы"*, *"Гісторыя сусветнай культуры"*, *"Сусветнае выяўленчае мастацтва"*. На прыкладах міжкультурнага ўзаемадзеяння студэнты самі могуць уяўляць асноўныя этапы развіцця сусветнай культуры і суадносіць з культурамі сваіх краін. Пры гэтым студэнты атрымліваюць інтэрнацыянальнае, патрыятычнае і эстэтычнае выхаванне; творчы патэнцыял студэнтаў раскрываецца падчас падрыхтоўкі навукова-даследчых работ, якія штогод прадстаўляюцца на круглым стале "Дыялог культур" у рамках дзён навукі ў МДЛУ.

На выяўленне творчага патэнцыялу студэнтаў накіравана і *пазааўдыторная* работа, якая пастаянна праводзіцца выкладчыкамі кафедры. Назапашаны вопыт узаемадзеяння знаходзіць практычнае праламленне ў студэнцкіх праектах і фестывалях "Я гімны матулі спяваю...", "Па шэдэўрах краіну я пазнаю" і "О Ражаство, О Ражаство", прысвечаныя папулярызацыі культурных традыцый з такіх краін, як Беларусь, Расія, Англія, Германія, ЗША, Егіпет, Іспанія, Турцыі, Францыя, у тым ліку: фестываль "*Я гімны матулі спяваю...*" прысвечаны папулярызацыі культурных традыцый святкавання Дня матулі ў розных краінах свету. Гэты фестываль праводзіцца са студэнтамі 2 і 3-га курсаў факультэта міжкультурных камунікацый. Пры падрыхтоўцы студэнты збіраюць і аналізуюць вялікі культуралагічны матэрыял, звязаны з паказам становішча жанчыны і вызначэннем яе ролі ў грамадстве, адлюстраваннем культурных вытокаў нацыянальнага свята Дня матулі і выяўленнем асаблівасцей яго правядзення ў розных краінах; фестываль студэнцкай творчасці "*Па шэдэўрах краіну я пазнаю*" праводзіцца студэнтамі 3-га курса ФМК і прысвечаны знаёмству з культурнай спадчынай такіх краін свету, як Беларусь, Расія, Англія, Германія, Іспанія, Італія, Чэхія, Францыя, Швецыя, перш-наперш тых краін, мовы якіх студэнты вывучаюць ва ўніверсітэце; з удзелам замежных студэнтаў фестываль "*О, Ражаство, О Ражаство*", падчас якога студэнты з розных краін свету знаёмяць моладзь з традыцыямі правядзення ўрачыстасцей, прысвечаных сустрэчы Ражаства; добрай традыцыяй сталі для студэнтаў універсітэта і сумесныя экскурсіі па памятных мясцінах Беларусі, у тым ліку ў музеі горада Мінска і іншых гарадоў

Беларусі. Мае добрую традыцыю і фотаконкурс студэнтаў *"Мая Радзіма – Беларусь"*.

Згаданыя фестывалі, экскурсіі і конкурсы праводзяцца ва ўніверсітэце штогод. Пры падрыхтоўцы гэтых мерапрыемстваў студэнты рыхтуюць мультымедыйныя прэзентацыі і літаратурна-музычнае суправаджэнне з выкарыстаннем вершаў, песень, тэатральных сценак, інструментальнай музыкі. Правядзенне мерапрыемстваў па фарміраванні асяроддзя актыўнага міжкультурнага ўзаемадзеяння стала трывалай традыцыяй нашага жыцця ва ўніверсітэце.